этычных прынцыпаў, праходзяць культурную інтэрпрэтацыю ў прадметна-рэчавым кодзе культуры, кодзе культуры, знакі якога ўтрымліваюць і даносяць розныя сэнсы, а фразеалагізмы з гэтым кампанентам набываюць функцыі эталонаў, стэрэатыпаў і сімвалаў.

## Літаратура

1 Лепешаў І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў. У 2 т. Т. 1: А – Л / І. Я. Лепешаў. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 672 с.; т. 2: М – Я / І. Я. Лепешаў. – Мінск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 704 с.

***К. А. Крукоўская***
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

# ПСІХАЛАГІЧНАЯ ФУНКЦЫЯ ПЕЙЗАЖУ Ў ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА «НА РОСТАНЯХ»

На думку даследчыкаў, адлюстраванне прыроды і пейзажу займае значнае месца ў многіх творах мастацкай літаратуры. Тэарэтыкі літаратуры выдзяляюць некалькі функцый пейзажу ў мастацкіх тэкстах, адна з якіх –псіхалагічная – “звязана з перадачай душэўнага стану персанажаў”, “падрыхтоўвае чытача да змен у іх жыцці”, “стварае псіхалагічны настрой успрымання тэксту” [1, с. 130]. Звернемся да прыкладаў яе рэалізацыі ў трылогіі Я. Коласа “На ростанях”. Заўважна, што ў творы часта сустракаецца вобраз дарогі, які, з’яўляючыся элементам пейзажу, робіць яго дынамічным, маляўнічым і, да ўсяго, адлюстроўвае перажыванні, настрой, пачуцці галоўнага героя: спрыяе паглыбленню яго засяроджанасці, супакойвае, развейвае невясёлыя думкі і турботы, напаўняе радасцю. Знаходзіцца ў дарозе для Лабановіча – натуральны стан. Ён абумоўлены як сюжэтам твора (герой падоўгу не затрымліваецца на адным месцы), так і любоўю маладога настаўніка да падарожжаў (яго вабяць *“неакрэсленыя далечы, маўклівыя і мудрыя ў сваёй задуменнасці”* [2, с. 38]). Настрой галоўнага героя ў творы наўпрост звязаны з настроем акаляючага асяроддзя, больш таго, яны узаемаабумоўленыя, таму цяжка вызначыць, што з’яўляецца першасным – псіхалагічны стан Лабановіча ці вясёлы / змрочны, як правіла, лясны, пейзаж. То чытач бачыць Андрэя ў дарозе радаснага і шчаслівага ад кахання: *“Штось прыемнае і радаснае ўлівалася яму ў душу ад гэтых новых малюнкаў і ад гэтага размашыстага бегу машыны”* [2, с. 19]. То Лабановічу ў дарозе пуста і самотна. Ён пакідае Цельшына і назірае статычныя, нерухомыя малюнкі: *“лес нерухліва развесіўшы свае галіны”, “вятрак з занямелымі ў вячэрняй цішы крыллямі”. “Дарога крута паварочвала”* [2, с. 175], а разам з ёй само жыццё настаўніка.

Такім чынам, пейзаж у трылогіі “На ростанях” выступае сродкам характарыстыкі ўнутранага стану героя. Чалавек і навакольная прырода ў Я. Коласа гарманічна ўзаемазвязаныя.

## Літаратура

1 Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры: дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей ВНУ / В. І. Яцухна; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. – 279 с.
2 Колас, Я. На ростанях / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 383 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ